студентов ориентированный характер. Это проявляется в изучении региональных особенностей деятельности библиотеки и потенциальных ее возможностей; в определении и проявлении творческой самореализации библиотекаря-маркетолога; в разработке индивидуальной практической программы, которая осуществляется в виде научно-творческого проекта и представляется преподавателю для анализа. При этом реализуется компетентностный подход к обучению, в процессе которого учитывается личность студента, его профессиональный стаж и опыт (при наличии), заинтересованность в творческой работе, осмысление личностных творческих способностей, культурно-познавательных интересов и запросов.

В заключение отметим, что дисциплина «Библиотечно-информационный маркетинг» является важным элементом в профессиональной подготовке специалистов в сфере маркетинга и менеджмента библиотечного дела. В процессе его усвоения студенты получают необходимый запас знаний, умений и навыков для продуктивной творческой работы в области маркетинга библиотечного дела.


1. *Бадмаев, Б. Ц.* Методика преподавания психологии / Б. Ц. Бадмаев. – М. : Наука, 2006. – 97 с.

2. *Петушко, Н. Е.* Библиотечный маркетинг : учеб.-метод. пособие / Н. Е. Петушко. – Минск : Белорус. гос. ун-т культуры и искусств, 2010. – 116 с.

3. *Семенова, А. А.* Приемы развития творческих способностей на лекции. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http: //www.conf-p.narod.ru/sl.2.2.htm. – Дата доступа: 12.01.2014.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Т. А. Пладунова,** *старшы выкладчык кафедры этналогіі і фальклору*

## ПРАБЛЕМЫ І ДАСЯГНЕННІ Ў ПРЭЗЕНТАЦЫІ ЭТНАФОНІІ КУПАЛЛЯ НА ФАЛЬКЛОРНЫХ ФЕСТЫВАЛЯХ СТУДЭНТАМІ СПЕЦЫЯЛІЗАЦЫІ «ЭТНАФОНАЗНАЎСТВА»

Праблема трансляцыі традыцыйнай спеўнай культуры беларусаў як адной з культурна-гістарычных адметнасцей народа зразумела спецыялістамі культурна-адукацыйнай сферы. Яна

падштурхоўвае фалькларыстаў-практыкаў, этнапедагогаў, спевакоў-аматараў да пошуку шляхоў і сродкаў яе вывучэння і адэкватнай прэзентацыі. Перспектыўным уяўляецца абрадавае свята як найбольш цэласная сістэма поліфункцыянальных па змесце і прызначэнні кодаў, музычна-вербальнага (песні) у тым ліку.

Шматлікія фалькларысты зацвердзілі за раннетрадыцыйнай песняй (каляндарнай ці сямейнага цыкла) азначэнне «люстэрка абраду», таму як песня амаль заўсёды каментуе абрад і акумулюе яго міфалагічны змест. Яна дае канву абрадавым дзеянням, канстатуе ўсё, што здзяйсняецца ў абрадзе, або перадае яго ў іншасказальнай форме [3, с. 25]. Па выказваннях этнамузыколага, даследчыка рэгіянальных купальскіх традыцый Беларусі Г. В. Таўлай, менавіта песня апавяшчала ўдзельнікаў абрадавага рытуалу аб тым, што адбываецца. Захоўваючы выпрацаваную стагоддзямі сістэму міфалагічных абрадавых уяўленняў, яна з’яўлялася свайго роду сцэнарам Купалля. Усё, што здзяйснялася па абрадавай традыцыі альбо паказвалася сродкамі народнай пантамімы і харэаграфіі, знаходзіла адлюстраванне ў песні.

На прыкладзе адпраўлення Купалля ў другасных формах фальклярызму (у аматарскай фальклорнай творчасці) хочацца давесці некаторыя аспекты вывучэння і засваення яго самабытных праяў.

Не сакрэт, што ў цяперашні час перад намі паўстае праблема знікнення «жывых» абрадаў, і адным з рашэнняў дадзенай праблемы з’яўляецца іх мастацкая рэканструкцыя. Адрозненне ад аўтэнтычнага абраду ў тым, што яго выконваюць не носьбіты традыцыі ў натуральным вясковым асяроддзі, а сучасныя фалькларысты-практыкі і аматары народнай творчасці. Распрацоўцы тэарэтычных падыходаў да рэканструкцыі традыцыйных абрадаў, пошуку шляхоў і сродкаў пераймання і адэктватнай прэзентацыі абрадавай этнафоніі прысвечана праца кафедры этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Ад пачатку стварэння кафедры (2003) студэнтамі і выкладчыкамі праводзіцца экспедыцыйна-даследчая фалькларыстычная праца, назапашаны аўдыявідэафонд этнафоніі абрадавых і пазаабрадавых практык рэгіёнаў. Фальклорныя запісы з Полаччыны і Глыбоччыны і сёння натхняюць аўтара да постфальклорнай купальскай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

феерыі, якая штогод адбываецца ці ў ваколіцах Мінска (Вязынка, Ракаў, Строчыцы) ці на буйным фестывалі фальклорнага мастацта «Берагіня» (г.п. Акцябрскі Гомельскай вобласці) [1, с. 260].

За апошнія гады святкавання назапашаны вялікі спеўны рэпертуар, які паслужыў сістэматызацыі рэгіянальных узораў у «Купальскі спеўнік» [2]. У ім змешчаны купальскія песні, гульні і танцы, у розныя гады запісаныя айчыннымі Фальклярыстамі Р. Шырмай, Г. Цітовічам, Т. Варфаламеевай, Л. Касцюкавец, У. Раговічам. Большую частку «Спеўніка» складаюць песні са збораў З. Мажэйка (песні беларускага Паазер'я і Палесся) і Г. Таўлай (песні ўсіх рэгіёнаў). Асобнае месца займаюць песні Полацкага Купалля, запісаныя Р. Гамзовіч, В. Калацэем і Т. Пладуновай, большасць з якіх друкуецца ўпершыню.

Папярэднічаў «Купальскаму спеўніку» рукапісны песенны зборнік, які склала яшчэ ў сярэдзіне 80-х гадоў мастак і грамадскі дзеяч Валянціна Якімовіч [5, с. 175–181]. Па яе «спеўніку» шматлікія творчыя аб'яднанні, у іх ліку гурты «Дзянніца» і «Госціца», калектывы навучэнцаў Беларускага гуманітарнага ліцэя, супрацоўнікі Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту развучвалі песні і святкавалі Купалле ў Вязынцы і Строчыцах (праводзіла «спеўкі» В. Якімовіч). Фарміраваўся гэты зборнік з вопыту правядзення постфальклорных Купалляў, арганізаваных грамадскімі аб'яднаннямі «Майстроўня» (музычнай часткай кіравала Л. Сімаковіч, кіраўнік слыннага фальклор-тэатра «Госціца», беларускі кампазітар і харэограф), «Талака» (лідар – гісторык і літаратар С. Вітушка, музычныя кіраўнікі – А. Ткачова і А. Бобер з гурта «Голас»), фальклорнай суполкай г. Заслаўя «Летуценнікі» (лідар – мастак Т. Гаранская, музычны кіраўнік – хормайстар А. Ліпніцкая). Дзякуючы гэтым суполкам і іх яскравым прадстаўнікам, Купалле распачало свой постфальклорны рух у канцы XX ст. і перакінулася ўжо ў XXI ст. – заклікам бубнаў і дудаў, голасам абрадавых спеваў, магіяй агню і вады, гульняў і танцаў, якія ўтварае сёлентняя фальклорная моладзь (фальклорныя гурты «Верас», «Ветах», «Талака», «Гасцінец», «Вянок», «Калыханка», «Кудзьмень», «Гуда», «Княжыч», «Горэнь», «Этна-Суполка», «Вяснянка», «Страла», «Раме», інш.).

У «Купальскім спеўніку» ўкладальнік імкнуўся адэкватна адлюстраваць этнафанічную партытуру беларускага Купалля і



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прадставіць уласны творчы падыход у рэчышчы мастацкага рэканструявання свята. Так, тэрмін «рэканструкцыя» ў навукова-даследчых працах айчынных фалькларыстаў, метадычных распрацоўках рэжысёраў свят уяўляецца як сучасна адаптаванае ўзнаўленне абрадавага дзеяння на рэгіянальнай дакументальнай аснове, ва ўсіх яго асноўных этапах, з захаваннем вербальных, этнафанічных, пластычных і драматычных кампанентаў. Такім чынам, намі вылучаны асноўныя прынцыпы мастацкай рэканструкцыі абраду: дакладнасць увасаблення абраду, вуснасць пераймання ўсіх яго кампанентаў, актуальнасць функцыянальнага зместу абраду ў сацыяльна-культурным і эстэтычным запатрабаванні грамадства.

Вопыт сучасных «купалаванняў» багаты, менавіта ён і паслужыў выпрацоўцы гэтага падыходу. Абагульніць і асэнсаваць гэты вопыт прызвана метадычная распрацоўка аўтара «Абрадавая карта Купалля»[1], якая акумулюе асноўны змест свята і тэзісна паказвае яго сцэнарый («па гарызанталі» і «па вертыкалі»).

Акцыянальным кодам адпавядаюць належныя песенныя ўзоры, што, на нашу думку, уяўляецца вельмі важным у засваенні і прэзентацыі этнафоніі Купалля – кожны этап свята агучаны належнай песняй на пэўны тыпавы напеў. Па даследаваннях Г. Таўлай, гукавы сімвал Купалля прадстаўлены на Беларусі рэгіянальна адметнымі варыянтамі сямі асноўных тыпавых напеваў [3, с. 25]. У адной вёсцы Купалле можа гучаць на тры–пяць мелодый – тыпавых напеваў, – і ўсе яны ўяўляюць своеасаблівы гукавы пашпарт свята, праходзячы скразнымі промнямі праз усе яго абрадавыя цырымоніі (такім чынам апяваючы ўсе акцыянальныя коды свята). За адной мелодыяй (тыпавым напевам) замацавана некалькі песенных тэкстаў, розных па функцыянальным змесце, але агульных па мэтавым абрадавым прызначэнні.

Этнафанічная палітра Купалля на Беларусі разнастайная, і яе праявы залежаць ад функцыі і кантэксту спеваў. Адзін з галоўных крытэрыяў выканальніцтва – гэта гучныя «галасныя» спевы ў акустыцы прыроднага асяроддзя, якія яскрава дэманструюць экстравертную энэргетыку этнафоніі ўсяго вясноваletняга перыяду.

[1] Абрадавая карта рэгіянальнага свята распрацавана Т. А. Пладуновай у рамках вучэбнай дысцыпліны «Методыка арганізацыі фальклорнай дзейнасці» як метад сістэматызацыі кампанентаў свята (кодаў) на аснове методыкі гістарычнай рэканструкцыі абрадаў расійскіх вучоных Н. І і С. М. Талстых [4, с. 370–385].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Таблица*

## Абрадавая карта Купалля на Беларусі (фрагмент)

| **Акцыянальны код** *Ход абрадавых дзей* | **Тэмпаральны код** *Час летняга сонцавароту –23–24 чэрвеня (06–07 ліпеня)* | **Лакатыўны код** *Месца адпраўлення абрадавых дзей* | **Персанальны код** *Кола ўдзельнікаў, персанажы* | **Атрыбутыўны код** *Абрадавая атрыбутыка і прылады ў абрадавых дзеях* | **Музычна-вербальны код** *Песеннае і вербальнае суправаджэнне абрадавых дзей* | **Музычна-інструментальны код** *Інструментальнае суправаджэнне абрадавых дзей* | **Пластычны код** *Пластычнае увасабленне і харэаграфічнае суправаджэнне абрадавых дзей* |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| **1.** Збор зёлак і завіванне вянкоў | На працягу светлавога дня | Луг, поле, лес | Дзяўчаты, жанчыны | Святаянскія зёлкі і кветкі (рута, браткі, багатка, валошка, папараць, салодка, канюшына, лапух, канапляны цвет, рамонак, чарнабыльнік, ліпнік, палын, ружа) | 1) песні-купалкі, у якіх распавядаецца пра сэнс збірання зёлак, кветак і завівання вянкоў; 2) купалкі перадшлюбнай тэматыкі; 3) купалкі, у якіх выказваецца просьба добрага надвор'я для купальскага гуляння | – | Пляценне вянкоў – седзячы (стоячы) на зямлі |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **2**. Абход вёскі (двароў) – склі-канне грамады на свята | Надвя-чорак (перад заха-дам сонца) | Вясковыя вуліцы, падворак хаты | Уся гра-мада на чале з Ку-палінкай (разам з Купалі-шам). «Старцы» (травес-цыйныя персанажы продкаў «Дзед» і «Баба») | Шэст з купальскім колам уверсе ці з мазніцай (прымацава-най ёмкасцю з палаючым агнём). За-паленыя паходні | 1) купалкі, што заклікалі грамаду ісці на гулянне; 2) дыферэнцава-ныя Купалкі да абходу двароў. Дыялогі паміж гаспадарамі і ку-пальскай дружы-най: заклікі ісці на Купалле і за-пыт-патрабаванні падарункаў «купальнічкам» | Купальскія найгрышы на дудзе, скрыпцы | Шэсце шарэнгамі |
| **3.** Абход жыта | Вечар (на за-хадзе сонца) | Межы жытнёва-га поля | Жанчыны на чале з Купалін-кай (разам з Купалі-шам) | Шэст з купальскім колам уверсе ці з мазніцай (прымацава-най ёмкасцю з палаючым агнём) | Купальскія песні аграрнага зместу: 1) звароты да Ку-палы (Мар'і, Іва-на, Іллі) абыйсці жыта з мэтай до-брага ўраджаю і перасцярогі ад ведзьмы; 2) купалкі-заля-цанні дзяўчат да хлопцаў («Пой-дзем, дзеўкі, кру-гом жыта») | – | Шэсце шарэнгамі, парамі, «ланцуж-ком»; карагоды: кругавыя, «кры-вым танком» |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Продолжение*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **4.** Адорванне Купалінкай дзяўчат вянкамі | Вечар, ноч (пасля захаду сонца) | Луг, лес, поле | Дзяўчына-Купалінка і незамужнія дзяўчаты | Вянкі, сплеценыя са святаянскіх кветак | Песні, звернутыя да Купалы і яе дачкі (Купалінкі). Пажаданні-зычэнні Купалінкі дзяўчатам добрага лёсу, жаданага шлюбу і інш. | – | Шэсце (шарэнгамі), карагоды (кругавыя) |
| **5**. Дзеі, прымеркаваныя да распальвання і ўтрымання купальскага агню, спальвання купальскага дрэва, бараны | Поўнач, ноч (да новага ўсходу сонца) | Гара, высокае месца над ракой ці возерам, лес, перакрыжаванне дарог, поле (жыта) | Уся грамада, Купалінка (разам з Купалішам), ведзьмакі і нячысцікі, «старцы» | Купальскае вогнішча. Шэст з колам уверсе, аздобленым вянком з дубовых ветак і купальскіх кветак, усталяваны ў цэнтры вогнішча. Запаленыя паходні. Купальскія вянкі, букеты кветак, крапівы. | 1) песні, звернутыя да сонца, месяца, Купалы (Купаліша, Купалінкі), Іллі, Бога з просьбай раскласці агонь; 2) купальскія карагоды; 3) купальскія антыфоны-перапевы двух і больш спеўных гуртоў; 4) жартоўныя песні-пікіроўкі, у якіх высмейваліся хлопцы і дзяўчаты свайго | музычнае суправаджэнне песень: на дудзе, дудке (акарыне), скрыпцы, барабане. Музычнае суправаджэнне гульняў і танцаў: дуда ці гармонік (баян); традыцыйная | 1-3) Карагоды: кругавыя, «крывым танком», «кола ў коле», «ручайком праз вароты». Статычнае спяванне гуртоў у дзвеtры «шоры»; 4-6) скокі праз вогнішча (паасобку хлопцаў і парамі з дзяўчатамі); скокі старых і малых праз букеты кветак, крапівы; перакідванні дзяўчат і хлопцаў вянкамі праз агонь; |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | Арэлі. Барана, аздобленая кветкамі | сяла;<br>5) песні, што высмейвалі дзяўчат суседняга сяла;<br>6) песні, якія высмейвалі недахопы асобных хлопцаў і дзяўчат;<br>7) купалкі любоўнай і сямейнай тэматыкі;<br>8)купальскія балады;<br>9) гульні-заляцанні хлопцаў да дзяўчат;<br>10) прымеркаваныя гульні вяснова-летняй пары;<br>11) прыпеўкі да танцаў;<br>12) лакальны спеўны рытуал «Барана» | беларуская капэла ў складзе: дуда, скрыпка, цымбалы; дуда, скрыпка, дудка, барабан (бубен); гармонік, скрыпка, цымбалы; гармонік, скрыпка, барабан (басэтля) | гойданне на арэлях;<br>7-8) спевы седзячы, (стоячы) вакол вогнішча;<br>9-11) шарэнгавыя карагоды дзяўчат і хлопцаў («сценка на сценку»); іншыя мясцовыя варыянты кампазіцый гульняў (купальскіх і прымеркаваных да вяснова-летняй пары) і пабытавых танцаў;<br>12) спальванне бараны-статычнае спяванне |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На аснове дадзенай абрадавай карты і яе этнафанічнага каментарыя – «Купальскага спеўніка» – абрадавае свята магчыма адаптаваць да рэгіянальнага (міжрэгіянальнага) ці агульнанацыянальнага Купалля шляхам вылучэння асобных абрадавых этапаў і падбору да іх песенных узораў (адпаведна мэце правядзення свята).


1. Купалле на «Берагіні» // Берагіня: Пяты рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва (2006–2008) / уклад. М. А. Козенка. – Мінск : Чатыры чвэрці, 2008. – 271 с.

2. Купальскі спеўнік : метад. дапам. / аўтар-уклад. Т. А. Пладунова. – Мінск : Інстытут культуры Беларусі, 2013. – 160 с.

3. *Тавлай, Г. В.* Белорусское купалье: обряд, песня / Г. В. Тавлай. – Минск : Наука и техника, 1986. – 174 с.

4. *Толстой, Н. И.* К реконструкции древнеславянской духовной культуры (лингво- и этнографический аспект) / Н. И. Толстой, С. М. Толстая // Славянское языкознание : VIII Междунар. съезд славистов, Загреб-Любляна, сент. 1978 г. : докл. сов. делегации. – М. : Наука, 1978. – 469 с.

5. *Якімовіч В.* «А йшла Купалка сялом, сялом». Князь – Купаліш і Купалінка // Роднае слова. – 1998 г. – № 6.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**А. В. Предеина,**
*доцент кафедры теории и истории информационно-документных коммуникаций, кандидат педагогических наук*

## ИСПОЛЬЗОВАНИЕ ОБРАЗОВАТЕЛЬНЫХ ИННОВАЦИОННЫХ ТЕХНОЛОГИЙ В ПРОЦЕССЕ ПРЕПОДАВАНИЯ ДИСЦИПЛИН СПЕЦИАЛИЗАЦИИ «БИБЛИОТЕЧНО-БИБЛИОГРАФИЧЕСКОЕ КРАЕВЕДЕНИЕ»

Опыт использования в педагогической деятельности инновационных методов позволяет выделить их преимущества: они помогают научить студентов активным способам получения новых знаний; дают возможность овладеть более высоким уровнем личной социальной активности; создают такие условия в обучении, при которых студенты не могут не научиться; стимулируют творческие способности студентов; помогают приблизить учебу к практике повседневной жизни, формируют